

*М. В.* ***Сірата.***

да — малой радзімы, хаты, зерня — абнаўлення, нараджэння новага, еднасці чалавека з прыродай і няспыннага руху часу, пачатку. Захапленне тропамі ў С. таксама абумоўлена абстрагаваннем паэта ад будзённасці, пошукам крыніц натхнення ў міфе і фальклоры.

*Тв.*: Выбр. творы. Т. 1—2. Мн., 1995—97.

*Літ.*: Кабаковіч А. Беларускі свабодны верш. Мн., 1984; Лобан М. Пяць раніц тыдня. Мн., 1984; Лысенка А. Лінія гарызонта: Нарыс творчасці Я.Сіпакова. Мн., 1986.

*І. М. Гоўзіч.*

**СІРАТА́** Мікалай Васілевіч (н. 17.6. 1941, в. Драмайлаўка Кулікоўскага р-на Чарнігаўскай вобл., Украіна), баяніст, дырыжор, кампазітар (аранжыроўшчык). Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (1986). Скончыў Бел. кансерваторыю (1969). З 1965 артыст Дзяржаўнага нар. аркестра Беларусі імя І.Жыновіча, з 1969 выкладчык Гомельскага музычнага вучылішча, кіраўнік арганізаванага ім Квартэта баяністаў, з 1974 музычны кіраўнік Дзяржаўнага акадэмічнага нар. хору Беларусі імя Г.Цітовіча. З 1997 выкладае ў Бел. педагагічным універсітэце. На аснове бел. музычнага фальклору стварыў цыклы праграм для хору імя Г.Цітовіча «Звонкія галасы Беларусі», «З глыбінь жыватворных», кампазіцыі «Веснавыя гульні», «Купальскія абрады і гульні», «Калядныя абрады і гульні», «Дажынкі» і інш., а таксама для шматлікіх нар. ансамбляў; некаторыя з іх апублікаваў у зборніках «Дзе мы хадзілі, дзе гулялі», «Інструментальныя творы для ансамбляў народных інструментаў у апрацоўцы М.Сіраты» (абодва 1998). Апрацаваў бел. нар. песні для хору «Чырвоная рабіначка», «Вянок веснавых песень», «Ой, вецер вее», «Пахаджала дзеванька», «Гэй, раскідайцесь, зялёныя лісточкі», «Каля лесу туман», «Закукуй, зязюлька» і інш., для салістаў вакальных і інструментальных ансамбляў. Аўтар выданняў «Шле вітанне вам Беларускі хор» (1990), «Весялушкі» (1994), расшыфровак некаторых фалькл. запісаў І.Назінай «Беларускія інструментальныя найгрышы» (1986), «Беларуская інструментальная музыка» (1989).

*А. М. Аляхновіч.*

**СІРО́ЦКІЯ ПЕ́СНІ**, лірычныя песні, адрасаваныя сіраце. Уяўляюць сабой аповед пра сіроцкую долю-нядолю. Яны самыя журботныя і тужлівыя ў песенным фальклоры беларусаў. Увага да сіроцкага лёсу — адна з праяў прыроднай гуманнасці беларусаў, іх нац. менталітэту. У песенных творах такога роду сірата — адзін з улюбёных нар. мастацкіх вобразаў, якому моцна спачуваюць і аўтар-песнятворца, і нават сам Бог, які навучае сірату, дзе знайсці мамку і як яе дабудзіцца:

Бяжы, дзіця, у чыста поле,
У чыстым полі гаёк стаіць,
У тым гайку — магілачка,
А ў магілачцы — твая мамка.
Прыдзі к ёй паціхусеньку,
Гукні яе памалюсеньку:
А устань, устань, мая мамачка,
А устань, устань, мая родная,
Абуй жа мне босу ножачку,
Памый жа мне бела лічыка
І спляці мне русу косачку,
Дай жа мне белу кашулю.

Паводле нар. песень, сірата заўсёды паўгалодны, недагледжаны, босы, брудны, з нячэсанай галавой. Цяжкасць сірочай долі характарызуе жыццё сіраты з душэўна-халоднай і нядобразычлівай мачыхай:

Ліха мачыха — непрыятніца:
Ножку буе — па ножцы б'е,
Лічка мые — па лічку б'е,
Коскі пляце — валасочкі рве,
Кашулю дае — праклінае:
«Бадай, дзіця, не знасіла,
Каб другую не прасіла».

Доля сіраты ў нар. паэзіі параўноўваецца з палыном:

Ой, палын, палын — трава горкая,
А доля мая — яшчэ горшая.

Адзінота і адрынутасць з'яўляюцца дамінуючымі фактарамі ў сіроцкай скрусе і журбе. У народзе жыве прымаўка: «Бог сірату любіць, але долі не дае». Дзяўчыне-сіраце ў мінулым цяжка было напаткаць сваё шчасце. Беспасажніца не магла разлічваць на добрае замужжа і на добразычлівыя адносіны да сябе з боку радні мужа ў асяроддзі, дзе часта багацце лічылася асноўным аргументам для ацэнкі чалавечай годнасці.

*Літ.*: Гурскі А. І. Семантыка і паэтыка сямейнай лірыкі. Мн., 2001; Яго ж. Сямейная лірыка // Беларускі фальклор: Жанры, віды, паэтыка. Мн., 2002. Кн. 3. Пазаабрадавая паэзія.

*А. І. Гурскі.*

**СІСТЭ́МА ПРАЗАІ́ЧНЫХ ЖА́НРАЎ**, гл. ў артыкуле *Народная проза.*